# РАБОЧЫ АДКАЗ НА ПАЛІТЫКУ ЛУКАШЭНКА

**Інфляцыя, падзенне беларускага рубля, банкаўскі крызіс, бюджэтны крызіс, праблемы з імпартам, пустыя прылаўкі — усё гэта не проста наступствы эканамічнага крызісу і вынік не злой волі цёмных сіл, а заканамерныя вынікі палітыкі прэзідэнта і ўрада апошніх гадоў.**

Інфляцыю разагнаў навагодні подкуп выбаршчыкаў — перадвыбарныя абяцанні былі шчодра аплочаны паперай з друкаванага станка, не забяспечанай таварамі. У выніку рост коштаў на бульбу за студзень-люты склаў 30% (гэта нягледзячы на 10% рост ўраджаю ў 2010), на іншую гародніну — больш за 10%.

Крупы толькі ў лютым падаражэлі на 15,5%, цукар — на 9,9%, ялавічына — на 4,5%. Падскочылі і тарыфы ЖКГ: электразабеспячэнне — на 12%, водазабеспячэнне і каналізацыя — на 14,6%, сеткавы газ — на 83,7%! За адзін толькі тыдзень траўня кошты выраслі на 12–17%! Пры гэтым рэальная зарплата (з улікам росту спажывецкіх цэнаў на тавары і паслугі) у студзені ў параўнанні са снежнем упала на 12,9%.

Каб абараніць свае зберажэнні і зарплаты, насельніцтва пачало скупляць больш надзейную, з яго пункту гледжання, валюту: даляры і еўра. З-за гэтага, а асабліва з-за продажу валюты «сваім» банкам па выгодным курсе, вычарпаліся рэзервы Нацбанка.

Ураду давялося пайсці на дэвальвацыю — абясцэніць рубель адносна іншых валют, каб гаспадары маглі больш выгодна прадаваць тавар за мяжу.

Беларуская эканоміка зайшла ў канчатковы тупік. Рэжым planue ўразанне бюджэту, скарачэнне працоўных месцаў і масавую прыватызацыю. Са студзеня, з прыняццём дырэктывы № 4, аб'яўляецца пераход да свабоднага рынку. Уступае ў дзеянне «Закон аб прыватызацыі дзяржмаёмасці» ў новай рэдакцыі, па рэкамендацыях МВФ і Сусветнага банка з 1 сакавіка скасоўваецца дзяржаўнае рэгуляванне цэн. **Усё гэта мы ўжо бачылі ў Расіі ў 90-я гады.** Гэта — шлях да галечы і масавага беспрацоўя. Так, прылаўкі, магчыма, хутка напоўняцца, вось толькі канчаткова спусьцеюць кашалькі шараговых працаўнікоў!

Аднак, замест прыняцця мер па абароне жыццёвага ўзроўню і заробкаў працоўных, кіруючы рэжым спрабуе заткнуць нам рот, забараніць казаць пра крызіс і імкнецца ўзмацніць паліцэйскі кантроль за настроямі на заводах і ў установах. Такі рэжым больш не мае права існаваць!

Толькі масавы і арганізаваны рух працоўных супраць злачыннага рэжыму можа спыніць будучы хаос!

Ужо сёння неабходна арганізоўваць страйкі і іншыя акцыі пратэсту. Нам трэба патрабаваць:

★ Індэксацыю заработнай платы ў адпаведнасці з ростам інфляцыі

★ Спыніць прыватызацыю. Рэнацыяналізаваць усе аддадзеныя ў прыватныя рукі прадпрыемствы. Усім дзяржаўным прадпрыемствам — рабочы кантроль і працоўнае кіраванне

★ Не — падразанню сацыяльнага бюджэту. Грошы на сацыялку, а не на сілавыя структуры. Адмовіцца ад выплат па ўсіх знешніх крэдытах!

★ Аграмадзіць фінансавы сектар. Усе сродкі накіроўваць на развіццё прамысловасці і інфраструктуры

★ Спыніць рэпрэсіі. Свабоду ўсім палітвязням!

★ Скасаваць усе антырабочыя, антыдэмакратычныя і антыпрафсаюзныя законы

★ Дэмакратычна планаваць вытворчасць, зыходзячы з патрэбаў рабочага класа і блізкіх да яго слаёў грамадства

**Мы не можам давяраць «ліберальнай» і «дэмакратычнай» апазіцыі, якая ў выпадку іх прыходу да ўлады будзе весці ўсю тую ж палітыку ў інтарэсах бізнесу, а не звычайных працоўных. Неабходны скліканне ўстаноўчага сходу ўсіх слаёў працоўных, для стварэння рабочага ўрада!**

КРІ
Камітэт за Рабочы Інтэрнацыянал

**SOCIALIST**WORLD.RU
cwi.belarus@gmail.com